УДК 398 (=161.3)

# ТЭМА МЛЫНАРСТВА ВА УСХОДНЕСЛАВЯНСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫЦЫ І ЭТНАГРАФІІ

***А.М. НЕНАДАВЕЦ***

*Бабруйскі філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта,*
*г. Бабруйск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Гэта толькі на першы погляд здаецца, што пытанне шырока даследавана і распрацавана. Калі пачынаеш знаёміцца з заключанымі ў ім праблемамі бліжэй, то высвятляецца адваротнае. Менавіта так атрымалася і з млынарамі, з млынамі, з іхнім месцам у тагачасным грамадстве, з шматлікімі «фантастычна–міфічнымі» асацыяцыямі адносна цеснай сувязі млынароў з нячыстай сілай (нячысцікамі), з чараўніцтвам–вядзьмарствам, а таксама адкрытае супрацьпастаўленне гэтых самых млынароў (даволі часта спецыяльна–мэтанакіраванае) усяму перадавому, свядомаму, высокаадухоўленаму. Пра тое, што ўсё гэта было, існавала, жыло некалі паўнакроўным жыццём, сведчаць шматлікія вуснапаэтычныя творы, міфалагічныя сцвярджэнні, запісы многіх фалькларыстаў і этнографаў, як рускіх, украінскіх, польскіх, так і беларускіх. Нават у наш цывілізаваны час многае з гэтай тэматыкі перадаецца «па традыцыі», амаль увогуле не змяняючыся, з нейкімі абавязковымі агаворкамі на таямнічасць, варажбу ці чараўніцтва, на свядомы «паддзел» у помству за нейкую да сябе непавагу, смех ці рэзкае адмаўленне значнасці млынара ў старадаўнім грамадстве. Нельга не згадаць і прафесійных літаратараў, якія таксама многа зрабілі для захавання гэтага шматаблічнага аспекта духоўнай спадчыны беларускага народа. Вельмі часта, не маючы магчымасці растлумачыць канкрэтныя эпізоды і дзеянні з жыцця пэўнай акрэсленай сацыяльна–прафесійнай групы (касты) людзей, ёй прыпісваліся фантастычныя здольнасці і ўласцівасці. І такім чынам яшчэ больш заблытваліся ўяўленні пра часта сустракаемых таямнічых персанажаў народнага жыцця. Ужо адно тое, што многае захавалася, не знікла бясследна, не адыйшло назаўседы, сведчыць пра значнасць праблематыкі, пра наданне ёй у жыцці патрыярхальных людзей немалаважнай увагі.

Тым не меней, нягледзячы на тое, што млыны і млынары вядомы нашаму грамадству ўжо на працягу многіх стагоддзяў, на самой справе аказалася, што нашымі папярэднікамі здзяйснялася толькі простае фіксаванне вуснапаэтычных матэрыялаў. Знайсці тэарэтычнае асэнсаванне актуальнага на той час пытання, ці хаця б спробу да яго – немагчыма. Яго проста не існавала. У тым і своеасаблівасць, і складанасць праблемы. З аднаго боку, здавалася б, усе вельмі даступна і на паверхні, а з іншага – недаследаванасць і бессістэмнасць. Усе гэта, мабыць, і адштурхоўвала даследчыкаў, якія спрабавалі прыступіць да раскрыцця згаданага пытання. Простае заўсёды потым аказваецца складаным.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першым з айчынных фалькларыстаў, хто запісаў сустрэтыя ім звесткі пра млынароў і апублікаваў іх потым у сваей працы «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов»[1], быў А.Я. Багдановіч. Праўда, млынам і млынарам ён адводзіў вельмі мала ўвагі, бо не ставіў перад сабою за мэту падрабязны разгляд гэтага аспекта. Ды і ўвогуле, на той момант з запісаў вуснапаэтычных матэрыялаў у яго быў невялікі асабісты запас. Адным словам, аўтар падаў тое, што ў яго было зафіксавана на час напісання ці падрыхтоўкі згаданай працы ў друк. Тым не меней, запісаныя ім сведчанні гавораць пра тое, што беларускія сяляне на той час яшчэ цверда верылі ў чараўнічыя здольнасці і вядзьмарскія «штучкі» млынароў, у праяву іхніх магчымасцей у будзенным жыцці, ва ўсемагчымыя ўплывы на адвечны лад вясковых традыцый. А ўлічыўшы апантанае захапленне А.Я. Багдановічам міфічным светам старажытных беларусаў, іхнімі перакананнямі і звычаямі, то менавіта з гэтай нагоды, відаць, складваецца ўражанне, што нават сам аўтар кнігі на пачатку XX стагоддзя не адмаўляў усемагчымыя павер'і і аповяды, звязаныя з жыццём і дзейнасцю прадстаўнікоў гэтай таямнічай касты.

Вядома, што і П.В. Шэйн актыўна збіраў звесткі пра млынароў у «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо–Западного края. 1887–1902» у трох тамах (нас цікавіць найбольш трэці том) [2]. Ен занатоўваў таксама вуснапаэтычныя творы, у якіх так ці іначай гаварылася, у асноўным, пра вядзьмарскія справы млынароў, пра страхі і прымхі, якія ў беларускім народзе неадрыўна суправаджалі гэтых людзей. Усё гэта было ўведзена ў ранг фантастычных замалёвак, якія шырока характарызавалі тагачасны ўклад жыцця жыхароў вескі, стварала іхнюю непахісную веру ў магчымасць пэўных вяскоўцаў, асабліва пры асабістым жаданні, весці хаўрус з дэмана-

ПолесГУ

лагічнымі персанажамі беларускай міфалогіі (найбольш папулярным выступала тут наступнае выслоўе – «сувязь з нячыстай сілай»). На жаль, у запісах П.В. Шэйна знайшлі адлюстраванне матэрыялы з паўночнай часткі тагачасных беларускіх земляў, бо пераважная колькасць ягоных інфарматараў была з гэтай тэрыторыі. Адзіны істотны недахоп у дзейнасці гэтага актыўнага даследчыка заключаўся ў тым, што амаль ўсе свае вуснапаэтычныя і этнаграфічныя матэрыялы, зафіксаваныя ім на тэрыторыі Беларусі, ён дасылаў для далейшай публікацыі рускаму міфолагу А.М. Афанасьеву. Бясспрэчна, гэта ў некаторай ступені зніжала каштоўнасці памкненняў і самаахвярнай працы П.В. Шэйна, ставіла яго на другое месца пасля таго, хто іх апублікаваў. Тым не меней, рускі даследчык увеў вялікую колькасць атрыманага ад П.В. Шэйна вуснапаэтычнага матэрыялу ў шырокі ўжытак, чым спрыяў пашырэнню беларускіх матываў і сюжэтаў у гэтым плане. Гэта азначала, што зробленае збіральнікам не прападзе марна, не знікне назаўседы ў віхуры стагоддзяў. Так яно ў далейшым і атрымалася.

Адзначым самабытныя распрацоўкі беларускага этнографа і фалькларыста Я.А. Ляцкага, які яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя апублікаваў дзве працы: «Представления белоруса о нечистой силе» і «Материалы для изучения творчества и быта белорусов. 1. Пословицы, поговорки, загадки»[3]. У іх ён раскрыў крыху тэму млыноў і млынароў, удзяліў належную ўвагу сувязі гэтых заклятых, паводле народных сцверджанняў, мясцін і іхніх чараўнікоў-уладароў, з праявамі нячыстай сілы, з самой нячыстай сілай і нячысцікамі. Немалаважна і тое, што фалькларыст запісваў матэрыял амаль не адыходзячы ад арыгіналаў вуснапаэтычных тэкстаў. На прыкладах, што сведчаць пра старажытнасць урыўкаў, ляжыць адбітак першастваральнай прымхлівасці і забітасці. Найбольш характэрная ў гэтых адносінах праца, якая называлася «Представления белоруса о нечистой силе». Другая – «Материалы для изучения творчества и быта белорусов» – своеасаблівы помнік матэрыяльнай культуры нашых далекіх продкаў. Недзе адтуль пайшло «гуляць» і стала агульнапрынятым, што 25 кастрычніка у народным календары пазначаны як дзень млынароў. З пачатку XVII і да сярэдзіны XX стагоддзя ў Беларусі былі надзвычай распаўсюджаны ветракі, а раней – вадзяныя млыны, што не здзіўляе, асабліва ўлічваючы вялікую колькасць рэк. Дарэчы, мноства вадзяных і ветраных млыноў захавалася і да нашых дзен, напрыклад, на Гродзеншчыне (у Іўі і Гальшанах).

Мабыць, найбольш эфектыўна ў плане фіксацыі, сістэматызацыі і аналізу народнай міфалогіі, фальклору, а таксама актуальных тады праблем вядзьмарства і знахарства (у гэтым плане ім закранальася і дзейнасць млынароў) з ліку даследчыкаў XIX – пачатку XX стагоддзяў быў Е.Р. Раманаў. Ягонае шматтомнае выданне «Белорусский сборник» можна смела назваць у нейкім плане энцыклапедычным. У дадзеным выпадку нас найбольш цікавіць вып.8. (Вільня, 1912)[4], дзе падаваліся шматлікія этнаграфічныя замалеўкі, вуснапаэтычныя творы, у якіх так ці інакш асвятлялася роля млынароў. І тут асноўны акцэнт скіроўваўся на міфалагічна-фантастычныя характарыстыкі, якія на час збірання матэрыялаў вучоным захоўваліся яшчэ ў масах сялянскага жыхарства. Зрэдку вучоны спрабаваў усе ж падаваць калі не тэарэтычна–метадычнае асэнсаванне тэмы млынарства, дык рэальныя погляды народных дарадцаў на гэтую сацыяльную групу. Неабходна адзначыць, што ім нават была распрацавана своеасаблівая анкета–апытальнік, якую ен рассылаў сваім карэспандэнтам. Некаторыя з пытанняў (выгляд млынара, сувязь з вядзьмарствам, месцажыхарства, паводзіны, размяшчэнне млына і іншыя) сведчылі пра тое, што Е.Р. Раманаў надаваў гэтай тэме важнае значэнне і спрабаваў любым чынам дайсці да першаснасці пакланення і табуацыі гэтай касты, якая адметна вылучалася сярод асноўнай масы вяскоўцаў. Ен звярнуў увагу на тое, што прафесійныя навыкі («уменне») перадаваліся сярод млынароў толькі па спадчыннасці і з абавязковым захаваннем таямнічасці і кананічнасці гэтага рытуала.

Значна паглыбіўся, але, зноў-такі, не ў тэарэтычным плане, у даследаванні гэтага пытання А.К. Сержпутоўскі. Накірунак ягоных экспедыцыйных пошукаў можна, праўда, звузіць да сумежжа Брэсцка–Мінскага рэгіену (у сучасным тэрытарыяльным падзеле), да Палесся, дзе ен найчасцей веў свае палявыя запісы. Тым не меней, праца вучонага «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў»[5] да гэтага часу лічыцца ўзорам сярод работ такога плану. У ей млынарам адведзена значнае месца, як і паводзінам гэтых людзей, прыкметам і павер’ям, якія ў народзе сведчылі, што яны карысталіся сярод вяскоўцаў павагай, аўтарытэтам, але, адначасова, мелі і адмоўную характарыстыку. Апошні аспект быў цесна звязаны з вядзьмарствам і з дэманалагічнымі здольнасцямі млынароў. Атрымлівалася, што А.К. Сержпутоўскі ў нечым нібы своеасабліва працягваў справу Е.Р. Раманава. Асабліва выразна гэта адчуваецца на дэманалагічна-прымхлівай характарыстыцы прадстаўнікоў млынарства і што адметна – падаецца такая істотная рыса праз пацвярджэнне шматлікімі прыкладамі з рэальнага жыцця. Вельмі цікава пададзены апісанні заняткаў і нават паа-

ПолесГУ

собныя абрады і павер'і, якіх цверда прытрымліваліся гэтыя людзі ў сваей працоўнай дзейнасці і ў будзенным жыцці. Неабходна ўлічваць яшчэ і тое, што сведчанні, сабраныя ў гэтай кнізе, адносяцца да канца XIX − пачатку XX стагоддзя, а гэта лішні раз падкрэслівае жывучасць традыцый адпаведнай накіраванасці.

Згадаем і пра тое, што вуснапаэтычную спадчыну беларусаў актыўна вывучалі польскія даследчыкі. Мы павінны быць удзячны ім за гэтую цікавасць да нашай духоўнай культуры, бо менавіта дзякуючы іхнім намаганням, многае з самабытных абрадаў, вуснапаэтычных твораў, этнаграфічных замалевак было своечасова апублікавана і таму ўжо назаўседы застанецца ў скарбонцы духоўных здабыткаў нашых продкаў. Тут неабходна, найперш, вылучыць прозвішча Ч. Пяткевіча і ягоную манаграфію «Рэчыцкае Палессе» [6]. Ужо сама назва сведчыць пра прывязанасць працы да канкрэтнага вузкамясцовага рэгіена Беларусі. Мала таго, што вучоны паспрабаваў апісаць традыцыйны знешні выгляд, паводле народных уяўленняў, млынара, дык яшчэ і зафіксаваў тое, як, у якіх населеных пунктах, з якімі абрадавымі дзеяннямі будаваліся самі млыны. Агульнавядома, што ў палешукоў усе было «распісана» зараней – дзе можна будаваць, а дзе – ні ў якім разе, бо там забараняялі нешта ўзводзіць з гаспадарчых будынкаў народныя прадказанні і прыкметы. З гэтым не жартавалі і ўсе прымалі так, як гаварылася ці перадавалася старэйшымі. Немалаважны факт і тлумачэнне таго месца, якое займаў самы звычайны млын ў будзенным жыцці беларусаў. Нават тое, як туды выбіраліся ехаць, як сябе пры гэтым паводзілі вяскоўцы, і, адпаведна, якімі пэўнымі этычнымі нормамі (!!!) суправаджаліся такія паездкі сялян. Пры гэтым нейкія характэрныя (важныя) асаблівасці маглі праяўляцца ў самых розных, незаўважных на першы погляд і дробязных, акалічнасцях.

З рускіх даследчыкаў, акрамя ўжо вышэй згаданага А.М. Афанасьева [7], матэрыялы пра беларускія млыны і млынароў, зноў-жа, паўторымся, менавіта як пра носьбітаў пэўных рысаў вядзьмарскай сілы, можна адшукаць у зборніках І.П. Сахарава, найперш у «Сказаниях русского народа, собранных И.П. Сахаровым» [8]. Аднак, і ў гэтым выпадку разлічваць на нейкі пашыраны ці паглыблены аналіз не выпадае, бо даследчык пайшоў па шляху простай публікацыі матэрыялу, які быў ім назапашаны як падчас самастойных экспедыцый, так і ад карэспандэнтаў з розных губерняў Расійскай імперыі. Асабліва адзначым добрае веданне і старанны адбор вуснапаэтычных пер-шакрыніц. У той жа час вучоны стараўся зрабіць так, каб у ягоныя зборнікі не траплялі занадта прымхлівыя і, як яму самому здавалася з гэтай нагоды, непраўдападобныя звесткі. Гэта сведчыла пра тое, што ен імкнуўся да своеасаблівай «рэалізацыі» тых звестак, якія да яго паступалі.

Нельга не заўважыць значны ўклад у публікацыю беларускіх матэрыялаў па гэтай тэме выдатнага рускага даследчыка У.І. Даля. У ягоным «Толковом словаре живого великорусского языка»[9] (т.3. стар. 317–318) зафіксаваны прыклады з тагачасных губерняў Паўночна–Заходняга краю. У артыкуле «Поверия, суеверия…», на стар. 191–200, 221–222 расказваецца пра дэманалагічны вобраз вадзяніка, тлумачацца і паясняюцца асноўныя яго функцыі, а таксама тое, як з ім быў звязаны ці асацыіраваўся ў народнай свядомасці млынар. Належная ўвага ўдзяляецца тым характэрным рысам, якія праяўляліся ў млынара, калі яму пагражала нейкая небяспека з боку вяскоўцаў (раскрылі ягоныя махлярствы, асуджалі ягоную чорную варажбу ці ўчыненыя ўжо раней злодзействы і г.д.). На стар. 222, 281–282 прыводзяцца прыклады і павер'і, якія характарызавалі асобу гэтага чалавека, пацвярджалі шматлікія факты ягонай не толькі прыносячай карысць людзям, але і, як самі вяскоўцы лічылі, ягонай злачыннасці.

Неаднаразова прыводзіў беларускія матэрыялы ў сваей агульнавядомай працы «Нечистая, неведомая и крестная сила» [10] С.В. Максімаў. Праўда, гэтая ягоная работа вылучаецца ўвогуле адсутнасцю якой бы там не было тэарэтычнай асновы, але тое, што ім было зафіксавана, сведчыла пра цесныя сувязі гэтага вучонага з беларускай міфалогіяй і фальклорам. Абавязкова агаворымся, што рабіў ен гэта праз сваіх шматлікіх карэспандэнтаў з рэгіенаў Паўночна–Заходняга краю.

Сюды ж можна далучыць і прозвішча Дз.К. Зяленіна, і ягоную шырокавядомую працу «Восточнославянская этнография» [11]. Адпаведна, ў ёй значнае месца адведзена будаўніцтву млыноў, але і гэта, тым не меней, не малазначна, бо згадваюцца абрады і прыемы, дзеянні і традыцыі, характэрныя для ўзвядзення такіх пабудоў. Яшчэ адна немалаважная рыса: у даследаванні пададзены параўнаўчы матэрыял, характэрны для беларусаў, рускіх і украінцаў. Такая акалічнасць дае магчымасць адразу ж убачыць адметнасць будаўніцтва млыноў беларусамі, ці ў чым іменна гэтая адрознасць заключалася. У многім гэтая работа характэрна яшчэ і тым, што ў ёй сабраны звесткі пра млыны, пра іх узвядзенне, у некаторай ступені яны нават сістэматызаваны.

У кнізе Л. Ракавай «Гісторыя на градках: агародніцтва на Беларусі» [12] гаворыцца пра тое, што млыны на старажытных беларускіх землях маглі будаваць і валодаць імі, выкупляючы права



ПолесГУ

на такую справу ды аплочваючы потым падаткі ў дзяржаўную казну, сяляне–заможнікі, памешчыкі, шляхта і шляхціцы, манастыры, свяшчэннікі, мяшчане (с.16).

Ва ўкраінскай фалькларыстычнай літаратуры млынам і млынарам найболей увагі ўдзелена ў наступных працах: П.П. Чубінскі «Труды этнографическо–статистической экспедиции в западно–русский край, снаряженной Императорским Русским Географическим обществом [13]. – СПб.: Типография П. Безобразова, 1877. – т.1. – Вып.1. – 467 с. (звесткі пра млынароў з паветаў Падольскай губерні); А. Цярэшчанка «Быт русского народа». – СПб.: типография военно–учебных заведений, 1848.Ч.6.[14] – 221с. (звесткі з Левабярэжнай Украіны, найбольш, з Палтаўшчыны); У. Даманіцкі «Историко–этнографические мелочи из материалов З. Доленго–Ходаковского» [15] // Киевская старина. – Киев. 1904.–т.86.– сентябрь. С.86–89; Мамине серце: Українські народні героіко–фантастичні казки»[16] // Упоряд., підгот. текстів, вступ. ст., прим. та словник. І.В. Хланти, М.І. Хланти.– Ужгород.: Патент, 1993.– 280 с.

Што датычыць навукова–тэарэтычнай распрацоўкі дадзенага пытання ў сучаснай беларускай фалькларыстыцы і міфалогіі, то можна назваць працы толькі двух даследчыкаў: У.І.Коваля – прафесара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны і аўтара гэтых радкоў. Гомельскі навуковец здолеў сабраць і сістэматызаваць матэрыялы пра млыны і млынароў, якія ен адшукаў у працах па ўсходнеславянскай этнаграфіі, фальклору і міфалогіі [17]. Размясціўшы іх такім чынам, вучоны зафіксаваў тое, што традыцыі млынарства ў побытавым жыцці беларускага народа адміраюць, роўна як і шматлікія павер'і, прымхі і абрады, з імі звязаныя.

А.М. Ненадавец у сваіх манаграфіях: «Сілаю слова. Белая і чорная магія» і «Праклятыя словам» (асабліва ў першай) [18] пастараўся паказаць народныя сцвярджэнні аб сувязях млынароў з нячыстай сілай, з традыцыямі вядзьмарства. Некаторыя закранутыя аспекты ўвогуле асвятляюцца ўпершыню (адносіны млынароў да рэлігіі, падпарадкаванне іхняй волі звышістотным сілам, абярэгі, татэмы і прадметы–фетышы, якімі актыўна карысталіся млынары, імкнучыся да дасягнення ўласнай мэты, а таксама сіла замоўнага слова ў здзяйсненні вядзьмарскага працэсу і г.д.). Ім жа данесены да чытача абрадавыя дзеянні, паднашэнні млынароў, напрыклад, вадзянікам, адзначаецца, што ў апошнія дзесяцігоддзі ўсе гэта імкліва разбураецца, забываецца і яму ўдзяляецца ўсе менеей і меней увагі.

У энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» (Мінск,1989) [19], на стар.131 ёсць артыкул «Вятрак (млын ветраны)», аўтар Л.І. Мінько. У ім распавядаецца пра перыяд узнікнення ветраных млыноў не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і на землях усходніх славян таксама. Аргументавана тлумачыцца значэнне гэтага прыстасавання для развіцця вясковай, найперш, гаспадаркі, згадваюцца перыяды найбольшага росквіту (будаўніцтва) ветракоў на нашых землях і з чым гэта было звязана, а яшчэ падаюцца звесткі з раней апублікаваных прац па тэме млынарства. Даследчык не забывае падкрэсліць і факт цеснай сувязі мясцовых валадароў з варажбою і чараўніцтвам, таму што, паводле народнага вынікала, – яны не проста так маглі «запрэгчы вецер», прымусіць гэтую магутную прыродную стыхію працаваць на карысць людзям, а ў іхніх «душах нешта было…». Вядома ж далека не заўседы праца млынароў і значэнне млынарства ў беларускім народзе ацэньвалася аднназначна, але гэта было звязана ў асноўным з прымхлівасцю, якой былі авеяны ў народнай традыцыі самі млынары.

У гэтай жа энцыклапедыі, на стар. 322, пад аўтарствам таго ж даследчыка змешчаны яшчэ адзін артыкул – «Млын вадзяны». У ім, на колькі гэта дазваляла выданне, даволі поўна і доказна раскрываецца тэма будаўніцтва і асаблівасці ўзвядзення млыноў, якія функцыі, акрамя асноўнай, імі выконваліся (валянне сукна, прамыванне і часанне воўны, ачышчэнне збожжа і г.д.), а яшчэ гаворыцца пра тое, што гаспадары млыноў – млынары (мельнікі) – умелі прыстасавацца да наравістай воднай стыхіі, прыносілі ей шматлікія ахвяры-паднашэнні і за кошт менавіта такіх дзеянняў забяспечвалі сабе апякунства валадара вады, вадаемаў, пэўных праяў воднай стыхіі – вадзяніка. Адзначаецца, нават па рэгіенах рэспублікі, дзе было болей вадзяных млыноў, а дзе – меней, дзе ўвогуле аддавалі перавагу ветракам і з якімі прычынамі гэта было звязана.

У двухтомнай энцыклапедыі «Беларускі фальклор» (т.2. Мінск, 2006) [20], на стар. 171 змешчаны артыкул «Млынар» (аўтар А.М. Ненадавец). У ім распавядаецца пра шматлікія вуснапаэтычныя творы, якія зафіксаваны даследчыкамі беларускага фальклору на працягу значнага перыяду і звязаныя з усемагчымымі варыянтамі апавяданняў і казак, паданняў і быліčак, распавядаючых пра жыцце і чарадзейныя «штучкі» млынароў, пра факты іхняга гнюснага зладзейства, учыняемага супраць сумленных працаўнікоў. Асаблівая ўвага надаецца і тэме запрададзенасці душы ў выпадках, дзе гаворка вядзецца пра млынароў, пра шляхі іхняга ўзбагачэння, пра шкодныя («злосна–зайздросныя») вочы, на якія пападацца лішні раз асабліва не рызыкавалі нават узбагачаныя жыц-

ПолесГУ

цевым вопытам сталыя вяскоўцы. Падаюцца прыклады моўных («замоўных») засцярог і слоў, якія дапамагалі пазбегнуць страшных наступстваў праклёнаў і злых выслоўяў з боку млынара. Пра тое, што гэтакія прыклады існавалі ў рэальным жыцці (ці і ў фантастычна-прымхлівым плане) апавядалі шматлікія інфарматары. У народзе стала ўтрымліваўся нават традыцыйны выгляд млынара, ягоны «партрэт», які пастаянна падмалёўваўся нейкімі характэрнымі рысамі і асаблівасцямі ў залежнасці ад змен у сацыяльна-грамадскім ладзе, дакладней, у будзенным укладзе жыцця беларускіх сялян.

**Заключэнне.** Неабходна адзначыць, што ва ўсходнеславянскай літаратуры, прысвечанай млынарам, і ўсемагчымых вуснапаэтычных творах, якія тлумачылі чарадзейныя, варажбітныя і вядзьмарскія здольнасці гэтай касты, даволі поўна праследжваецца народная прымхлівасць і забітасць, з–за якой многае з патрыярхальнага, адсталага захоўвалася ў народнай свядомасці на працягу шматлікіх стагоддзяў. Новае ўносілася ў гэты аспект вельмі і вельмі марудна і толькі пры той умове, што яно ўжо сотні разоў было пацверджана самімі сялянамі і выступала не нейкай таямнічай фантастычнай сілай, а паўставала ў рэальным плане як пэўныя сцэны будзеннасці. Да апошняга часу ў тэме млынарства не хапала таксама строгай сістэматызацыі, матэрыялы былі параскіданыя па многіх выданнях і таму паўставала надзеннае пытанне іхняй класіфікацыі і збора ў адзінае цэлае.

## ЛІТАРАТУРА


1. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Гродна : 1895. – 186 с.
2. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо–Западного края.1887–1902: в 3 т./ П.В.Шейн. – Спб.: 1902.–Т.3.–518 с.
3. Ляцкий, Е.И. Представления белоруса о нечистой силе / Е.И.Ляцкий // Этнографическое обозрение.–1890.–№4. – С.17–28; его же : материалы для изучения творчества и быта белорусов. 1.Пословицы, поговорки, загадки / Е.И.Ляцкий // Чтения в императорском Обществе истории и древностей российских при Московском университете. – 1898.– Кн.3. – С.74 – 86.
4. Романов, Е.Р. Белорусский сборник: в 9 вып. / Е.Р.Романов // Быт белоруса. – Вильно: 1912. – Вып.8. – 317 с.
5. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў–палешукоў. / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае. 1998. – 301 с.
6. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе. / Ч. Пяткевіч. – Мінск : Беларускі кнігазбор. 2004. – 672 с.
7. Афанасьев, А.Н. Поэтические воззрения славян на природу. В 3 т. / А.Н. Афанасьев. – М.: Современный писатель, 1995. – Т.2. – 400 с.
8. Сахаров, И.П. Сказания русского народа, собранные И.П.Сахаровым. / И.П. Сахаров. – М.: Художественная литература, 1990. – 398 с.
9. Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. В 4 т. / В.И. Даль. – М.: Русский язык Медиа, 2005. –Т.3. – 555 с.
10. Максимов, С.В. Нечистая, неведомая и крестная сила. Куль хдеба. / С.В.Максимов. – Смоленск, Русич, 1995. – 670 с.
11. Зеленин, Д.К. Восточнославянская этнография. / Д.К. Зеленин. – М.: Наука, 1991. – 412 с.
12. Ракава, Л.В. Гісторыя на градках. / Л.В.Ракава. – Мінск : Беларусь, 2009. – 129 с.
13. Чубинский, П.П. Труды этнографическо–статистической экспедиции в западно–русский край, снаряженной Императорским Русским Географическим обществом. / П.П. Чубинский. – СПб.: Типография П.Безобразова, 1877.– т.1.– Вып.1.– 467 с.
14. Терещенко, А. Быт русского народа. / А. Терещенко. – СПб.: типография военно–учебных заведений, 1848. – Ч.6. – 221с.
15. Доманицкий, В. «Историко–этнографические мелочи из материалов З.Доленго–Ходаковского» / В. Доманицкий. – Киевская старина.– Киев. 1904.–т.86.– сентябрь. – С.86–89.
16. Мамине серце: українські народні героіко–фантастичні казки. / Упоряд., підгот. текстів, вступ. ст., прим. та словник./ І.В. Хланти, М.І. Хланти. – Ужгород.: Патент, 1993.– 280 с.
17. Коваль, У.І. Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы. / У.І. Коваль. – Гомель : Беларускае Агенцтва навукова–тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 179 с.
18. Ненадавец, А.М. Сілаю слова. Белая і чорная магія. / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2002. – 350 с; Праклятыя словам. / А.М. Ненадавец. – Чарнігаў : Всесвіт, 2006. – 192 с.
19. Этнаграфія Беларусі. / В.К.Бандарчык, М.Ф.Піліпенка[ і інш.]. – Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 1989. – 575 с.
20. Беларускі фальклор. Энцыклапедыя. У 2 т.; пад агульнай рэд. А.С.Ліса. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2006. – Т.2. – 832 с.


Полесгу

## TOPIC OF THE MILLER’S ACTIVITIES IN THE EAST SLAVIC FOLKLORE AND ETHNOGRAPHY

*A.M. NENADOVETS*

***Summary***

The article discusses ethnographic data and records ustnopoeticheskogo material associated with the activity of millers («mlynarey»). The ratio of the Belarusian people to them had the ambiguous and explained by the fact that the activities and behavior of millers asssotsiirovalis with the evil spirit, the manifestations of binge demonological character. The author analyzes the Slavic literature, in one way or another covered the role of this narrow professional caste.

© Ненадавец А.М.

*Пастуnіў у рэдакцыю 23 лютага 2012 г.*

ПолесГУ